3. Мультсериал «Южный Парк» эпизод 410: «Попадают ли умственно отсталые в ад?» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.sp-fan.ru/episode/410/. — Дата доступа: 17.03.2016.

4. Мультсериал «Южный Парк», эпизод 411: «Возможно» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.sp-fan.ru/episode/411/. — Дата доступа: 17.03.2016.

5. Мультсериал «Южный Парк», эпизод 201: «Не без моего ануса» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.sp-fan.ru/episode/201/?v=goblin. — Дата доступа: 17.03.2016.

6. Интернет-база кинофильмов [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.imdb.com/. — Дата доступа: 17.03.2016.

7. Стариченок, В. В. Военная агрессия против Ирака 2003 г. и общественное мнение США / В. В. Стариченок // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст. В 2 ч. Ч. 1. Вып. 11 / под ред. В. Ф. Беркова. — Минск: РИВШ, 2011. — С. 223–230.

Пераклад англійскіх дзеяслоўных аналітычных форм на беларускую мову (на прыкладзе перакладу апавядання А. К. Дойла «Стракатая стужка»)

Бруцкая А. А., асп. БДУ,
навук. кір. праф. Роўда І. С., д-р філал. навук

Наша даследаванне прысвечана сапастаўленню англійскіх дзеяслоўных аналітычных форм (АФ), адабраных метадам суцэльнай выбаркі з апавядання А. К. Дойла «The Adventure of the Speckled Band», з іх беларускамоўнымі перакладамі. Перш чым прыступіць да анлізу дадзеных АФ, патрэбна вызначыць тэрміналагічную базу і акрэсліць межы даследавання.

І. А. Смірніцкі лічыць, што АФ — гэта свабодныя словазлучэнні, «словосочетание некоторого основного слова (в определенной его форме) с известным служебным словом (или с комплексом служебных слов)» [1]. Даследчык дыферэнцыруе фразеалагічныя спалучэнні і аналітычныя (свабодныя) формы. Першыя ўяўляюць сабой «адзінае ідыяматычна цэласнае слова», другія — адзіныя словы (у пэўнай граматычнай форме), якія маюць сінтэтычныя карэляты ў той жа граматычнай катэгорыі. Гэтага пункту гледжання прытрымліваюцца таксама такія даследчыкі, як Б. А. Абрамаў, М. М. Гухман, В. Н. Ярцава, В. М. Жырмунскі, Н. Д. Аруцюнава, У. У. Вінаградаў і інш. Разглядаючы паняцце АФ у больш шырокім сэнсе, Н. А. Лапаногава падкрэслівае наяўнасць моў, у склад якіх уваходзяць выключна АФ, якія не маюць сінтэтычных карэлятаў у той жа граматычнай катэгорыі. Такія

формы правамерна лічыць аналітычнымі, бо яны складаюцца са «службовага — мадыфікатара і лексічнага — дыферынцыятара элементаў» [2, с. 52].

Вызначаючы паняцце АФ у адносінах да англійскай мовы як спалучэнняў службовых слоў (auxiliary words) са знамянальнымі (basic words + grammatical suffixes), пры якіх апошняе ўдзельнічае ў словазмяненні, Л. С. Бархудараў падкрэслівае абавязковую наяўнасць у іх складзе асобых «перарывістых марфем»: «*be ...ing*» (is working, are playing), «*have ...ed/en/etc.*» (‘have seen’, ‘has helped’), «*be ...ed/en/etc.*» (‘is taken’, ‘were invited’).

Сярод лінгвістаў няма адзінага погляду на межы АФ. Некаторыя даследчыкі (А. І. Смірніцкі, Л. С. Бархудараў, В. Я. Плоткін і інш.) уключаюць у склад АФ англійскай мовы шматкампанентныя формы дзеяслоўнага часу, ладу, стану; іншыя (Ю. С. Маслаў, І. Б. Бірук і інш.) пашыраюць састаў АФ, далучаючы да іх шматслоўныя формы ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў, спалучэнні знамянальных слоў з прыназоўнікамі (як АФ склонаў), утварэнні з артыклем (як АФ перадачы «дакладнасці» / «недакладнасці»), АФ інфінітыву з часціцай «to».

Англійская і беларуская мовы бяруць пачатак ад індаеўрапейскай прамовы. Нягледзячы на тое, што ў кожнай з іх быў свой шлях развіцця, іх роднасць прасочваецца на розных моўных узроўнях, а таксама ў сістэмах слова- і формаўтварэння. Як у англійскай, так і ў беларускай мове ў найбольшай ступені аналітызм пры формаўтварэнні праяўляецца ў сістэме дзеяслова. Таму менавіта аналіз дзеяслоўных АФ выклікае асаблівую цікавасць.

У сваім даследаванні мы будзем разумець пад АФ спалучэнні двух і больш кампанентаў, якія служаць для перадачы граматычнага значэння шляхам узаемадзеяння знамянальнага слова (як носьбіта лексічнага значэння) і службовага сродку. Адсюль можна вызначыць межы дзеяслоўных АФ, у склад якіх мэтазгодна ўключаць АФ часу, стану і ладу.

Праводзячы аналіз АФ, адабраных з англамоўнага апавядання А. К. Дойла «The Adventure of the Speckled Band», мы выявілі 209 дзеяслоўных АФ, якія можна размеркаваць наступным чынам:

• АФ часу: ‘She **is waiting**’, ‘I **have heard** of you’, ‘I **shall be married**’ (65 %);

• АФ стану: ‘Mrs. Hudson **has been knocked up**’, ‘One wing **is** now **inhabited**’ (30 %);

• АФ ладу: ‘**Let** me **explain**’, ‘I **would** not **miss** it for anything’ (5 %).

Падчас даследавання было высветлена, што ў выніку розных марфалагічных пераўтварэнняў ва ўмовах падабенства і розніцы форм (нулявога і частковага перакладу, функцыянальнай і граматычнай замен, мадуляцыі, прыпадабнення, антанімічнага перакладу) англійскія АФ перакладаюцца на беларускую мову з дапамогай як шматкампанентных, так і аднакампанентных эквівалентаў:

• Аналітычныя эквіваленты перакладу: ‘Violence of temper approaching to mania **has been hereditary** in the men of the family’ — ‘Неўтаймоўнасць, якая межавала з маніякальнасцю, **была характэрная** для мужчынаў яго роду’; ‘my sister’s door **was unlocked**’ — ‘дзверы **былі адчыненыя**’; ‘the door **had been fastened** upon the inner side’ — ‘дзверы **былі замкнёныя** знутры’;

• Сінтэтычныя эквіваленты перакладу: ‘I **shall go mad**’ — ‘я зусім **звар’яцею**’; ‘which **was associated**’ — ‘**звязаная**’; ‘he unravelled the problems which **were submitted** to him’ — ‘ён расследаваў **прапанаваныя** яму справы’; ‘the walls **were** carefully **sounded**, and **were shown** to be quite solid all round’ — ‘Следчыя старанна **прастукалі** ўсе сцены, і яны паўсюль **аказаліся** моцнымі’.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што кампанентны састаў АФ сучаснай англійскай мовы дагэтуль да канца не высветлены. Сярод АФ англійскай і беларускай моў найбольш ужывальнымі з’яўляюцца дзеяслоўныя АФ, якія могуць перакладацца на беларускую мову як аналітычна, так і сінтэтычна.

Літаратура

1. Смирницкий, А. И. Морфология английского языка / А. И. Смирницкий. — М., 1959. — 440 с.

2. Лапоногова, Н. А. Глагольное аналитическое слово в современном английском языке / Н. А. Лапоногова // Проблемы аналитизма в лексике. — Минск, 1967. — Вып. 1. — С. 49–59.

Психологический портрет пользователя социальной сети импульсивного и самоконтролирующего типа

Быковская Е. Д., студ. IV к. БарГУ,
науч. рук. ст. преп. Яценко Т. Е., канд. псих. наук.

Ученые отмечают отсутствие в виртуальной коммуникации прямого эмоционального контакта и снятие жестких социальных конвенций ввиду физической непредставленности и в некоторой степени анонимности пользователей интернет-ресурсов [1, с. 24]. Указанное обстоятельство обусловливает возникновение проблемы целостного восприятия пользователем социальной сети, ориентированного на установление различного рода отношений, своего виртуального собеседника. В связи с этим актуальным представляется изучение психологических портретов пользователей социальных сетей.

Исследование проведено на базе Барановичского государственного университета. Выборку исследования составили 50 студентов педагогических специальностей. Цель исследования — выявление взаимосвязи личностных